*Ю.А. Пераверзева,*
*старшы выкладчык кафедры менеджменту*
*інфармацыйна-дакументнай сферы*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# ДЗЯРЖАЎНА-ПРЫВАТНАЕ ПАРТНЁРСТВА Ў БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЕ: ПРЫЗНАЧЭННЕ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РЭАЛІЗАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё галіны культуры, на думку П. П. Латушкі, немагчыма без стварэння сістэмы шматканальнага фінансавання і ўвядзення праграмна-мэтавага метаду бюджэтнага фінансавання [5]. У Дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. прадугледжваецца ўкараненне і паступовае пашырэнне праектнага фінансавання, заснаванага на мэтавых паказчыках і сацыяльных стандартах. Дзейнасць бібліятэк, безумоўна, будзе будавацца і развівацца сугучна азначаным прыярытэтам. Пры гэтым іх рэалізацыя залежыць ад паспяховасці прыцягнення ў культуру ўвогуле і ў бібліятэчную справу ў прыватнасці рэсурсаў недзяржаўных арганізацый, фізічных асоб, здольных мабілізаваць дадатковыя да бюджэтных крыніц фінансавання сродкі. Зрабіць гэта можна, выкарыстоўваючы патэнцыял дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Паняцце *дзяржаўна-прыватнае партнёрства* як навуковая катэгорыя з’явілася ў пачатку 90-х гг. XX ст. Яно мае брытанскія карані і асацыіруецца з так званай прыватнай фінансавай ініцыятывай (Private Finance Initiative), якая ўяўляе сабой мадэрнізаваную канцэпцыю кіравання дзяржаўнай уласнасцю. Яе сутнасць у тым, што на аснове дамоў і пагадненняў прыватны сектар атрымлівае права фінансавання (рэканструявання, будаўніцтва, кіравання і інш.) аб’ектаў сацыяльна-культурнай і вытворчай інфраструктуры, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці [1; 2].

З цягам часу, пры адсутнасці агульнапрызнанага вызначэння тэрміна *дзяржаўна-прыватнае партнёрства*, у навуковых публікацыях, афіцыйных ацэнках, каментарыях сродкаў масавай інфармацыі прапануецца шэраг яго трактовак. Разам з тым у іх можна вылучыць агульныя дэфініцыі: супрацоўніцтва паміж дзяржавай у асобе яго органаў з суб’ектамі гаспадарання, заснаванае на дамове; інстытуцыянальны і арганізацыйны альянс

дзяржаўнай улады і прыватнага бізнесу з мэтай рэалізацыі грамадска значных праектаў; сумеснае выкарыстанне дзяржаўнага бюджэту і прыватных сродкаў мецэнатаў, спонсараў, інвестараў; збалансаванасць інтарэсаў, правоў і абавязацельстваў партнёраў [1; 2; 3; 5].

Такім чынам, можна адзначыць, што дзяржаўна-прыватнае партнёрства ўзнікае як фармалізаваная кааперацыя дзяржаўных і прыватных структур, якая ствараецца спецыяльна для дасягнення пэўных мэт і абапіраецца на адпаведныя дамоўленасці бакоў.

Відавочна, што дзяржаўна-прыватнае партнёрства прывядзе да інстытуцыянальных змен у бібліятэчнай галіне. У першую чаргу яны будуць выкліканы неабходнасцю перагляду механізму простага і пашыранага ўзнаўлення вытворчасці, які існуе ў бібліятэках, распрацоўкі бягучых і стратэгічных планаў іх дзейнасці з улікам прынцыпаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства, арыентаваных на вырашэнне праблемы недахопу бюджэтных сродкаў праз укараненне ў работу бібліятэк прыватнаўласніцкага (грамадскага) кіравання, але без змены базавых адносін уласнасці. У гэтым кантэксце значная роля павінна надавацца апякунскім саветам, тым больш, што іх стварэнне нарматыўна замацавана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 308 ад 12 сакавіка 2011 г. Сярод прыярытэтных кірункаў дзейнасці апякунскіх саветаў вылучаюцца: садзейнічанне ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы, прыцягненні пазабюджэтных і іншых дадатковых крыніц фінансавання, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь; прапанаванне кірункаў, форм, памераў і парадак выкарыстання фінансавых сродкаў і іншай маёмасці, якая перадаецца па дамовах бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі, дамовах ахвяравання; аказанне дапамогі ў пошуку партнёраў і г.д. Яны маюць інфраструктурнае значэнне для бібліятэк, бо, з аднаго боку, спрыяюць пашырэнню іх знешняй прасторы праз узаемадзеянне з прадстаўнікамі розных сфер жыццядзейнасці грамадства, а з другога – фарміруюць умовы станаўлення інавацыйных кампанентаў унутранага бібліятэчнага асяроддзя, абумоўленых дзейнасцю ў новых умовах, звязаных з дзяржаўна-прыватным партнёрствам.

У сістэме дзяржаўна-прыватнага партнёрства асобае значэнне маюць грамадскія даброты, якія ў бібліятэках набываюць форму сацыяльна значных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг. Асноўная іх частка выробляецца бібліятэкамі самастойна, а пэўная частка ствараецца і рэалізуецца шляхам прыцягнення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэсурсаў і магчымасцей прыватнага сектара. Разам з тым, улічваючы гістарычна абумоўленую сацыяльную значнасць бібліятэк у грамадстве, мы можам сказаць, што характар грамадскіх даброт, якія прадастаўляюць бібліятэкі, уяўляе сабой метадалагічную складанасць. Па меркаванні экспертаў, «прырода сацыяльна значных даброт падобна да прыроды грамадскіх даброт, таму яны прадастаўляюцца карыстальнікам бясплатна ці па цэнах, якія не пакрываюць выдаткі іх вытворчасці» [4]. Таму эфектыўнасць працэсаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў бібліятэчнай справе павінна вызначацца сувяззю паміж дасягнутым вынікам і выкарыстанымі рэсурсамі.

Гэта значыць, што якасць работы бібліятэкі як сацыяльнага інстытута і гаспадарчага суб'екта ва ўмовах дзяржаўна-прыватнага партнёрства можа дасягацца праз рацыянальнае выкарыстанне наяўных рэсурсаў (дзяржаўных і прыватных), ініцыяванне такіх форм гаспадарання, як кантракты на выкананне пэўных работ і аказанне паслуг, арэндныя і лізінгавыя пагадненні, канцэсіі, і іншых узаемавыгадных форм узаемадзеяння бібліятэк і камерцыйнай сферы. Пры гэтым бібліятэка застаецца сімвалам грамадскага гуманізму, а яе фонды – найважнейшым элементам нацыянальнай самасвядомасці і агульначалавечай культуры.

Паспяховаму функцыянаванню бібліятэк у сістэме дзяржаўна-прыватнага партнёрства будзе садзейнічаць вырашэнне шэрагу задач:

– арганізацыя навукова-даследчай работы ў галіне дзяржаўна-прыватнага партнёрства бібліятэчных устаноў;

– распрацоўка канцэпцыі і стратэгіі дзяржаўна-прыватнага партнёрства бібліятэк, у тым ліку ўнясенне змен у нарматыўна-прававыя дакументы, якія рэгулююць развіццё бібліятэчна-інфармацыйнай інфраструктуры краіны;

– распрацоўка прынцыпаў і методык фарміравання і развіцця форм дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў дачыненні бібліятэк, умоў іх выкарыстання;

– падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў і кіраўнікоў да ажыццяўлення дзяржаўна-прыватнага партнёрства;

– распрацоўка новых мадэляў фінансавання бібліятэк і метадаў кіравання ў бібліятэчнай справе;

– выпрацоўка арганізацыйна-метадычных падыходаў да развіцця арганізацыйнай культуры бібліятэкі як умовы паспяховасці яе дзяржаўна-прыватнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Амунц, Д. М.* Концессионная модель совместного участия государства и частного сектора в реализации финансовоемких проектов / Д. М. Амунц // Справочник руководителя учреждения культуры. – 2005. – № 12. – С. 16–24.

*2. Государственно-частное* партнерство [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.imac.ru/vital_topics/state-private_partnership. php. – Дата доступа: 21.02.2012.

*3. Дерябина, М.* Государственно-частное партнерство: теория и практика / М. Дерябина [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http : // institutiones. com / general / 1079-gosudarstvenno-chastnoe-partnerstvo. html. – Дата доступа : 21.02.2012.

*4. Калабина, Е. Г.* Конструирование оценки социально-экономической эффективности деятельности организаций государственного сектора экономики / Е. Г. Калабина [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http : //www.aspe.spb.ru/reports/kalabina.doc. – Дата доступа : 29.09.2011.

*5. Латушко, П. П.* Пришло время устанавливать государственно-частное партнерство в сфере культуры / П. П. Латушко [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belta.by/ru/all_news/culture/Prishlo-vremja-ustanavlivat-gosudarstvenno-chastnoe-partnerstvo-v-sfere-kultury---Latushko_i_541440.html. – Дата доступа: 21.02.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ